Television via Active Mediation» (2001) also recognize that the female stereotype is the typical female who is dependant on the male, very feminine, or passive in nature.

Bromnick R.D. and Swallow B.L. in their work «A study of young people's values» in 2001 found that young people have values of the ideal situation where everything is perfect for themselves in the future. An experiment was conducted with 244 children between the ages of 11-16. Four open-ended questions were presented in regards to their philosophies of life, fears, and any underlying values. The girls sampled tended to focus mostly on relationships between their peers, family, and boys. On the contrary, boys tended to focus mainly on sports.

In Belarus there are a lot of people studying female stereotypes created by the mass media, which proves the universal peculiarity of the problem.

So, as we can see in our everyday life, the stereotypes of females, created by the mass media, greatly influence our social life. These stereotypes sometimes make us hang labels on people and make us build boarders between each other. But we always have a right to choose not to be under the pressure of the mass media, never judge people and estimate them in accordance with some stereotypes.

## КАНЦЭПЦЫЯ НАРОДНАЙ ГІСТОРЫІ Ў РАМАНАХ В. АДАМЧЫКА («І СКАЖА ТОЙ, ХТО НАРОДЗІЦЦА» І«ГОЛАС КРЫВІ БРАТА ТВАЙГО»)

**Т. А. Акуневич**

В. Адамчык – выдатны майстар эпічных твораў. Заходняя Беларусь, як вядома, была радзімай В. Адамчыка і крыніцай яго творчага натхнення. Тут ён знаходзіў тэмы, вобразы, сюжэты для сваіх твораў. Заходнебеларуская рэчаіснасць здавалася яму невычэрпнай крыніцай сацыяльных і маральных праблем, чалавечых характараў, менавіта гэта заходняя частка Беларусі ўяўлялася пісьменніку месцам, дзе знайшла найбольш балючае вырашэнне гісторыя народа напярэдадні і ў час Другой сусветнай вайны. Таму выглядае натуральным, што аўтар ставіць мэту стварыць серыю вялікіх эпічных твораў пра гэты няпросты этап нацыянальнай гісторыі. Такую эпапею складае тэтралогія В. Адамчыка «Чужая бацькаўшчына» (1978), «Год нулявы» (1983), «І скажа той, хто народзіцца» (1987), «Голас крыві брата твайго» (1990).

В. Адамчык належыць да пакалення так званых «шасцідзесятнікаў». Пісьменнікі гэтай хвалі адмаўляліся ад бесканфліктнасці, прыхарошвання рэчаіснасці, ілюстрацыйнасці ўсіх тых рысаў, якія былі ўласцівы пісьменнікам першага пасляваеннага дзесяцігоддзя. Адметнасцямі твор-

чага метаду В. Адамчыка з'яўляюцца лірызм і псіхалагізм яго твораў, якія прасочваюць кожную старонку яго твораў, пачынаючы з саміх герояў, заканчваючы дзеяннямі і ўчынкамі, што яны ўтвараюць.

Галоўная асаблівасць В. Адамчыка − яго своеасаблівае бачанне народнай гісторыі Беларусі. Гэтая асаблівасць вызначылася ў тым, што аўтар перш за ўсё засяродзіўся не на адлюстраванні грамадска-палітычных адносін, а на раскрыцці ўнутраных перажыванняў асобы, на досведзе найтанчэйшых зрухаў душы ўдзельнікаў падзей. Гістарычныя падзеі, сацыяльна-палітычныя пераўтварэнні з'яўляюцца вельмі значным фонам, на якім разгортваецца драма як асобнага чалавека, так і ўсяго народа ў цэлым. Творчая манера пісьменніка адрозніваецца павышанай цікавасцю да паказу найперш індывідуалізаваных, яскравых, адметных чалавечых характараў, што і прадвызначыла кардынальна іншы, нязвыклы пунт гледжання на народную гісторыю заходнебеларускага краю, які заключаецца ў пераламленні грамадскіх падзей у прыватным, асабістым, індывідуальным, у руху ад прыватнага да агульнага, у праецыраванні ўплыву рэчаіснасці з усяго народа ў цэлым на лёс жыхароў вёскі Верасава, на сям'ю Корсакаў.

Раман «І скажа той, хто народзіцца» паказвае цяжкасці на шляху ўсталявання савецкай улады на тэрыторыі ранейшай Заходняй Беларусі. Аўтар выкрывае жорсткую і беспрынцыпную савецкую ўладу, якая не толькі не прынесла збаўлення і не апраўдала надзей на доўгачаканае нацыянальнае адраджэнне, але ўсталявала новую прыгнятальную палітыку. В. Адамчык не замоўчвае цяжкасцей на шляху калектывізацыі, не абмінае праблему масавых рэпрэсій і чыстак, што закранулі ў большай ступені якраз тэрыторыю Заходняй Беларусі, бо шмат людзей у мінулым вымушана было так ці інакш мець дачыненні да польскай улады. Гэта і трагедыя Першай сусветнай вайны, адгалоскі якой уплываюць на лёс простых людзей і хуткае набліжэнне Другой сусветнай вайны.

Трагедыя Вялікай Айчыйнай вайны знаходзіць адбітак ў апошнім рамане тэтралогіі – «Голас крыві брата твайго». У гэтым рамане В. Адамчык засяроджваецца на пытаннях народнай гісторыі, на пакутах і турботах тых самых людзей, якія цярпелі гора як ад фашыстаў, так, у такой жа самай ступені, ад сваіх жа – ад партызанаў і паліцаяў. Менавіта ў гэтых раманах найбольш выразна выяўляецца яго асаблівае асэнсаванне народнай гісторыі. Ён не абагульняе герояў раманаў, а, наадварот, стварае разнапланавыя характары. Народ ва ўспрыманні пісьменніка не з'яўляецца агульнай масай, гэта сукупнасць людзей з рознымі поглядамі і светаўспрыманнем, рознымі імкненнямі і каштоўнасцямі. Такімі з'яўляюцца і героі раманаў В. Адамчыка, усе яны розныя. Ёсць сярод іх людзі сумленныя, чыстыя душой, такія, як сям'я Корсакаў. Для іх людское вышэй уласнага жыцця.

Напрыклад, Алеся Мондрых, якая дапамагае габрэю, нягледзячы на тое, што гэта можа быць небяспечна для яе ўласнага жыцця, ці Улас Корсак, які загінуў з-за свойго імкнення дапамагчы людзям, з-за таго, што хацеў адстаяць справядлівасць. Міця Корсак – вобраз барацьбіта за нацыянальную самасвядомасць. Але яго крокі на гэтым шляху яшчэ недастаткова ўпэўненыя. Ён уступае ў рады беларускай армейскай часці, што стварылі немцы, бо яму паабяцалі, што будуць змагацца за нацыянальнае адраджэнне. Увесь час Міця трывае цяжкасці і пакуты з-за сваіх поглядаў – спачатку сядзеў у польскай турме, потым – у савецкай. Гіне Міця ад рукі партызана Жэніка Рэпкі. В. Адамчык паказвае, што былі і супрацьлеглыя сям'і Корсакаў людзі, такія, як Рэпкі, якія праглі нажывы за кошт іншых. Былі і ніякія, такія, як Імполь, якія не мелі грунтоўных поглядаў. Менавіта такія людзі, на думку В. Адамчыка, і складаюць народную гісторыю, непрадказальную і драматычную.

Народная гісторыя ва ўяўленні пісьменніка − гэта гісторыя асобнага чалавека, адбітак агульнай гісторыі і рэчаіснасці народа на асабістым лёсе. Гэта і гісторыя яго роднага краю – роднай вёскі, а таксама гісторыі людзей, іх пакуты і пастаяннае змаганне за свабоду і шчасце. Аўтар разумее гэта так: «Пісаў і пісацьму сваё жыта, сваю дарогу ў полі, маладую бярэзіну пры хаце, ціш, вечар і сваю маці з дзяружкай зелля за плячыма». Разглядаючы народную гісторыю, В. Адамчык не браў за аснову гісторыю як навуку або школьны прадмет, яго цікавілі асабістыя лёсы людзей, хваляваў не столькі знешні, колькі ўнутраны свет яго герояў, іх псіхалогія, дыялектыка душы. Як народ складаецца з людзей, так і народная гісторыя В. Адамчыка складаецца з асабістых гісторый чалавечага жыцця.

## ИМИТАТИВЫ «ГОВОРЕНИЯ», «ХВАТАНИЯ» И «СТУКА» В КОРЕЙСКОМ И ИРАНСКОМ ЯЗЫКАХ

**А. С. Аскари**

Имитативика, или теория имитативов, – это наука об идеофонах и имитативах. Автором теории имитативов является Геннадий Емельянович Корнилов. Идеофон – это звук речи, символизирующий какое-либо свойство живой или неживой природы. Имитатив – подражание с помощью звуков объектам живой и неживой природы, а также их свойствам и качествам, событиям и явлениям. Имитативы состоят из идеофонов, также выражающих единицу смысла. Если в современных постимитативных языках имитативы низведены до статуса слов, то в предыдущую, имитативную, эпоху это были единственно возможные максимальные отрезки речи и фактически являлись предложением [1, с. 8, 12, 60].